**Заданні для азнаямляльнай практыкі**
**(1 курс: 27 июня – 23 июля)**

За час практыкі студэнты павінны:
1. Вывучыць структуру рэдакцыі, сакратарыята, аддзелаў.
2. Падрыхтаваць да друку 1 матэрыял пазаштатных аўтараў.
3. Падрыхтаваць да друку 3-4 уласныя матэрыялы інфармацыйных жанраў (заметкі).
4. Самастойна правесці карэктуру 1 нумара газеты.
5. Прымаць удзел у рэдакцыйных планёрках і лятучках, пазнаёміцца з работай розных аддзелаў, з творчай лабараторыяй лепшых журналістаў.

**Формы прадстаўлення студэнтамі справаздачнай дакументацыі**

У вызначаны тэрмін пасля завяршэння практыкі студэнт прадстаўляе кіраўніку-метадысту наступную справаздачную дакументацыю:
– творчую характарыстыку, падпісаную рэдактарам выдання і завераную пячаткай рэдакцыі;
– справаздачу аб практыцы. У ёй таксама ўказваецца спецыфіка выдання, у якім студэнт праходзіў практыку, аспекты сумеснай работы з кіраўніком практыкі ад рэдакцыі, удзел ва ўнутрырэдакцыйнай і масавай дзейнасці газеты. Справаздача павінна ўтрымліваць таксама аналіз пазітыўных і негатыўных бакоў работы рэдакцыі, разбор найбольш адметных эпізодаў уласнай практычнай работы, роздум аб творчых знаходках і праліках, назіранні за спецыфікай рэдакцыйных будняў, за работай вопытных журналістаў, заўвагі і пажаданні па арганізацыі практыкі;
– дзённік практыкі (пішацца ў адвольнай форме);
– апублікаваныя творчыя працы (у выпадку істотнай праўкі – арыгіналы работ, што дасць магчымасць меркаваць аб ступені апрацоўкі матэрыяла ў рэдакцыі);
– копіі прынятых да друку, але не апублікаваных пакуль матэрыялаў. завераныя пячаткай рэдакцыі і подпісам рэдактара;
– падрыхтаваныя да друку пісьмы чытачоў;
– паласу з самастойна праведзенай карэктурай;
– спіс публікацый у электронным выглядзе.

Уся дакументацыя павінна быць падшытая ў папцы з аформленым тытульным лістом і вопісам змешчаных дакументаў.

**ТЭРМІН ЗДАЧЫ ДАКУМЕНТАЦЫІ – 25 ЛІПЕНЯ 2016**